**В.М. Пярвоў**
Навуковы кіраўнік – М.У. Буракова
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога»*

# ПРАФЕСІЙНАЕ САМАВЫЗНАЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Прафесійнае самавызначэнне беларускай моладзі адыгрывае вялікую ролю ў працоўнай дзейнасці ў цяперашні час. Выбар прафесіі вызначае: прыналежнасць да сацыяльнай групы, будучы выбар прафесіі, месца працы, выбар стылю жыцця. Так, прафесійнае самавызначэнне – гэта не толькі рашэнне пра тое, што будзе крыніцай існавання маладога чалавека, але і прапанова спосабаў яго самарэалізацыі і жыццёвага самавызначэння. Мэтай нашай работы з'яўляецца аналіз беларускіх інфармацыйных электронных рэсурсаў,

якія даюць аб’ектыўны агляд папулярных прафесій сярод маладых беларусаў, а таксама выявіць асноўныя фактары, якія ўплываюць на іх выбар прафесіі.

Адным з галоўных рашэнняў, якія прымаюцца кожным маладым чалавекам, з’яўляецца выбар прафесіі [1, с. 308-310]. Існуюць розныя варыянты вызначэння паняцця ‘выбару прафесіі’, але ўсе яны падкрэсліваюць думку, што прафесійнае самавызначэнне прадстаўляе выбар, які ажыццяўляецца ў выніку аналізу ўнутраных рэсурсаў суб’екта выбару прафесіі і суадносіны іх з патрабаваннямі прафесіі. Так, на прафесійнае самавызначэнне моладзі ўплываюць наступныя фактары: 1) пазіцыя знаёмых, сяброў і іншых; 2) пазіцыя настаўнікаў, класнага кіраўніка, школьнага псіхолага; 3) пазіцыя бацькоў; 5) здольнасці або дасягненне ўзроўню развіцця маладога чалавека як суб’екта грамадскай дзейнасці; 6) інфармаванасць аб прафесіі; 7) схільнасць да той ці іншай дзейнасці; 8) асабістыя прафесійныя планы навучэнца (таксама выпадак іх поўнай адсутнасці, нявызначанасці). Структура такіх асабістых прафесійных планаў можа быць прадстаўлена наступным чынам: *галоўная мэта* (меркаванні маладых беларусаў пра будучыню і дасягненні); *уяўленне пра цяперашнія і будучыя мэты* (галіна дзейнасці, спецыяльнасць, работа, варыянты спробы сваіх сіл і інш.); *уяўленне аб знешніх умовах дасягнення намечаных мэт* (цяжкасці і перашкоды); *уяўленне аб унутраных умовах дасягнення намечаных мэт* (уласныя магчымасці, здольнасці да навучэння, стан здароўя, схільнасці да практычнай ці тэарэтычнай працы і іншыя асабістыя якасці); *запасныя варыянты дасягнення намечанных мэт*.

Такім чынам, сацыялагічны агляд за 2017-2018 гады, праведзены ў Беларусі, пацвярджае, што сярод фактараў, якія ўздзейнічаюць на прафесійнае самавызначэнне, беларуская моладзь указвае знаёмых, школу, прадстаўнікоў прафесійных вучэбных устаноў, бацькоў, сяброў, рэкламу і самастойны выбар. А самымі папулярнымі прафесіямі беларускай моладзі з’яўляюцца праграмісты, урачы (стаматолагі), прадпрымальнікі і бізнесмены, юрысты і менеджары (глядзі ніжэй дыяграмы № 1, № 2).




**Дыяграма № 1 «Фактары ўздзеяння на прафесійнае самавызначэнне»**




**Дыяграма № 2 «Агляд папулярных прафесій беларускай моладзі»**

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Волков, Ю.Г. Социология молодёжи: учебное пособие [Текст] / Ю.Г. Волков, В.И. Добреньков и [др.] / Под ред. проф. Ю.Г. Волкова. – Ростов н/Д.: Феникс, 2001. – 576 с.
2. Рынок труда Беларуси. Итоги 2016.[Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://jobs.tut.by/article/19797. – Дата доступа : 3.04.2019.
3. Обзор рынка труда Беларуси. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://trudbox.by/statistics/. – Дата доступа : 3.04.2019.